**Півавар М.В.**

# МАТЭРЫЯЛЫ ПЕРЫЯДЫЧНАГА ДРУКУ ЯК КРЫНІЦА ГІСТОРЫІ ПОШУКАВАГА РУХУ ВІЦЕБШЧЫНЫ

*Ключавыя словы: пошукавы рух, ваенна-патрыятычная работа, СМІ, Л.Н. Бруева, пошук.*

Пошукавы рух з’яўляецца важным накірункам грамадскага жыцця, значным элементам ваенна-патрыятычнага выхавання як у БССР, так і ў незалежнай Рэспубліцы Беларусь. Нарадзіўшыся ў 1960-я гг., рух “чырвоных следапытаў” стаў масавым, адыграў вялікую ролю ў выхаванні патрыятызму, любові да Радзімы, грамадзянскіх якасцяў моладзі краіны. Разам з працай дзяржаўных органаў кіравання, у супрацы з Беларускім добраахвотным таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры праводзілася праца па добраўпарадкаванні пахаванняў воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, паўсталі тысячы помнікаў, манументаў, усталяваны мемарыяльныя дошкі, створаны музеі баявой славы. У другой палове 1980-х – 1990-я гг. пошукавы рух некалькі змяніў прыярытэты, важным накірункам стала правядзенне раскопак на месцах былых баёў, пошук, выяўленне і перапахаванне байцоў Чырвонай Арміі, якія не былі належным чынам пахаваны. У другой палове 1990-х – 2000-я гг. прыярытэты зноў змяніліся, і удзельнікі грамадскага пошукавага руху, у першую чаргу моладзь стала дапамагаць у выяўленні не ўлічаных воінскіх пахаванняў, займацца ваенна-архіўнай работай, браць удзел у масавых патрыятычных мерапрыемствах выхаваўчага напрамку.

Час няўмольна бяжыць, вось ужо амаль 40 гадоў мінула з таго часу, як у г. Калуга ў 1988 г. на першым злёце пошукавых атрадаў СССР быў дадзены пачатак арганізаванаму пошукаваму руху. Пара падвесці вынікі яго дзейнасці, вызначыць асноўныя дасягненні, перспектывы росту, цяжкасці ў развіцці. Наспеў час стварыць працу, у якой асвятліць гісторыю пошукавага руху.

Яшчэ жывыя ўдзельнікі гэтага феномена ў грамадскім жыцці краіны. Ёсць магчымасць запісаць інтэрв’ю, сабраць сведчанні правадзімай працы. Але, для любога гісторыка асновай для напісання працы традыцыйна з’яўляюцца архіўныя дакументы. Па шэрагу прычын, матэрыялаў, якія б маглі праліць святло на гісторыю станаўлення і развіцця пошукавага руху вельмі мала. Прычын гэтаму шмат. Важнейшай з’яўляецца тая, што пошукавыя грамадскія арганізацыі, якія ўзнікалі напрыканцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. былі шматлікімі, але дзейнасць іх часта абмяжоўвалася некалькімі гадамі. Справаздачную дакументацыю, яны, як правіла, не вялі. А калі і вялі, то большасць матэрыялаў так і не былі перададзены ў дзяржаўныя архівы і, верагодна, страчаны назаўсёды.

Складана пераацаніць ролю Л.Н. Бруевай у пошукавым руху Беларусі. У 1980-я гг. яна стаяла ля вытокаў стварэння першых грамадскіх пошукавых арганізацый у БССР, яе намаганнямі была створана рэспубліканскае таварыства: Беларуская пошукавая асацыяцыя “ПОШУК”. Яна з’яўлялася кіраўніком гэтага таварыства на працягу 1995–2006 гг. Для гісторыі пошуку важнае значэнне мае кніга «Пока не похоронен последний солдат» [1], у якой Л.Н. Бруева ў форме нарысаў дала кароткую гісторыю пошукавага руху на Віцебшчыне, абагульніла досвед работы пошукавікаў амаль за 40 гадоў.

У Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці на захаванні знаходзіцца асабісты архіў Л.Н. Бруевай (Ф. 575). Фонд утрымлівае 45 спраў (827 дакументаў) за 1985–2022 гг., якія ўключаны ў вопіс № 1. На стронках 3–10 змяшчаецца гісторыка-

архіўная даведка да фонду, у якой захоўваецца біяграфія фондаўтваральніка і асноўныя вехі яе прафесійнай і грамадскай дзейнасці, вынікі і дасягненні кар’еры. Справы ў вопісе структураваны і падзелены на два вялікіх блока: “Дакументы да біяграфіі Л.Н. Бруевай” і “Дакументы аб пошукавай дзейнасці і ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны”.

Асаблівую каштоўнасць у стварэнні летапісу пошукавага руху краіны, на нашу думку, уяўляюць справы № 16, 17, 18 “Статьи из республиканских и местных СМИ о работе поисковых отрядов”. Тут змяшчаюцца артыкулы ў рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку (газеты “Рэспубліка”, “Во славу Родины”, “Белорусская военная газета”, “Сельская газета”, “Коммунист Белоруссии”, “Віцьбічы”, “Народнае слова”, “Жыццё Прыдзвіння”, “Лепельскі край” і інш.) з 1990 па 2019 гг., якія маюць дачыненне да пошукавай справы, праліваюць святло на развіццё, асноўныя тэндэнцыі пошуку на працягу гэтага перыяда. На жаль, не ўсе артыкулы можна анатаваць, некаторыя не маюць выходных звестак (назвы друкаванага органа, год, дакладнай даты выхаду ў свет, аўтарства) і іх атрыбутацыя магчыма толькі прыблізная. Разумеем, што у падборцы змяшчаюцца далёка не ўсе артыкулы на пошукавую тэматыку, якія друкаваліся на старонках СМІ. Артыкулы адлюстроўваюць суб’ектыўыя меркаванні аўтараў, якімі часта і выступалі ўдзельнікі пошукавага руху, а іх выбарка мае таксама суб’ектыўны характар.

Тым не менш, аналіз артыкулаў дае магчымасць лепей разумець рэаліі часу. Напрыклад, тых самых “ліхіх” 1990-х, якія ў нашы дні чымсьці дэманізаваны, чымсьці гераізаваны. Аднак праз радкі, напісаныя ў тыя часы, лепей разумееш, напрыклад, праблемы, якія стаялі перад пошукавікамі. У час, калі заробак настаўніка складаў некалькі дзесяткаў даляраў (у эквіваленце), калі інфляцыя складала некалькі сотняў працэнтаў, калі ў дэфіцыце былі самыя простыя рэчы, калі часам проста стаяла праблема, чым накарміць дзяцей, думаеш, а як жа ў гэтых цяжкіх умовах людзі займаліся пошукам, справай, ад якой іх жыццё не залежала, не прыносіла прыбытку, наадварот, часта вымагала вялікіх высілкаў для ажыццяўлення. У яркіх, безкампрамісных радках пошукавікоў адчуваеш іх боль і горыч за тое, што ў другой палове 1990-х гг. дзейнасць масавага, грамадскага пошукавага руху фактычна была забаронена. У артыкулах падымаюцца пытанні, чаму грамадскі пошукавы рух фактычна пастаўлены пад забарону? Упраўленне па ўвекавечанні прапанавала толькі такія формы работы, як сустрэчы з насельніцтвам (ветэранамі, ахвярамі і сведкамі вайны), запісы ўспамінаў відавочцаў і сведкаў вайны, праца ў архівах, удзел у святочных мерапрыемствах з абедам з салдацкай кашы. Прыпынена магчымасць удзельнічаць у раскопках на месцах баёў, а праца дзяцей катэгарычна забаронена. Галоўнай прычынай выказвалася небяспека падрываў на выбуховых прадметах у час раскопак. Але такіх за 12 гадоў арганізаванага руху не было ніводнага [2].

Праз пэўны час адбудзецца пацяпленне, будуць распрацаваны інструкцыі, якія дазволяць удзел у раскопках грамадскіх пошукавых атрадаў разам з ваеннаслужачымі 52 асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна, да ўдзелу ў вахтах памяці будуць дапушчаны і дзеці, але грамадскі пошукавы рух ужо верагодна ніколі не вернецца да таго размаху і масштабаў, які ён меў у другой палове 1980-х – першай палове 1990-х гг.

1. Бруева, Л. Н. Пока не похоронен последний солдат (из истории поискового движения в Витебской области): справочное издание / Л. Н. Бруева. – Орша : Оршанская типография, 2009. – 496 с.

2. Николай, брат Николая // Народнае слова. – 2008. – 24 мая. – С. 3.